Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

15 МАЯ 2018 г. АЎТОРАК № 90 (28706)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Лакальны брэнд Валожыншчыны**

СТАР. 8



**Мяцежная душа Міхаіла Глінскага**

СТАР. 9



**З АМАПа – у жаночы бодзібілдынг**

СТАР. 13

# ГУЛЬНЯ ПА ПРАВІЛАХ



Фота БелТА.

**У ЕАЭС важна цаніць і выконваць дасягнутыя дамоўленасці, а таксама паважаць адзін аднаго, як гэта прынята ў саюзнікаў і дзелавых партнёраў**

**Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета адбылося ўчора ў Сочы. Гэта першая ў бягучым годзе сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — членаў ЕАЭС. На саміт прыехалі прэзідэнты Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана і прэм'ер-міністр Арменіі. У якасці госця быў запрошаны Прэзідэнт Малдовы, і невыпадкова — на Вышэйшым савеце было прынята рашэнне аб наданні гэтай краіне статусу дзяржавы-назіральніка пры ЕАЭС. У цэлым падчас перагавораў у вузкім і пашыраным складах было разгледжана 14 пытанняў, у тым ліку праект пагаднення аб міжнародных дагаворах з іншымі краінамі ці аб'яднаннямі, рэалізацыя лічбавай павесткі ЕАЭС і асноўныя кірункі міжнароднай дзейнасці. На пасяджэнні таксама былі абмеркаваны асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі дзяржаў на 2018—2019 гады, лібералізацыя асобных сектараў паслуг на прасторы саюза.**

СТАР. 2

**Сёння ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень сям'і. Свята, якое яшчэ раз напамінае нам: сям'я — гэта галоўнае, што чалавек атрымлівае ў пачатку свайго жыццёвага шляху. На здымку шчаслівая сям'я СУМАР — маладыя бацькі Васіль і Анастасія разам з любімай дачушкай Надзеяй.**

# НАША ШЧАСЦЕ — БЫЦЬ СЯМ'ЁЙ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЛЯШЭНКА, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Кошт паліва ў Расіі і Беларусі не можа сур'ёзна адрозніваца. Аднак мы не можам казаць, што мадэрнізацыя прадпрыемстваў паўплывае на кошт паліва — такой залежнасці няма. Мадэрнізацыя больш адносіцца да блоку эфектыўнасці работы нашых прадпрыемстваў, якая ў выніку рэалізацыі праектаў павінна павысіцца. У прыватнасці, прадугледжана павелічэнне глыбіні перапрацоўкі нафты, выхаду светлых нафтапрадуктаў. Аб'екты знаходзяцца ў актыўнай фазе інвеставання, будаўніча-мантажных работ. Таксама адзначу, што кошт паліва будзе павышацца прапарцыйна кошту нафты. Мы ідзём сінхронна з нашымі калегамі з Расійскай Федэрацыі, сёння такая стратэгія».*

■ Клуб «Залатыя рукі»

# УСЕ ГРАНІ МАЙСТЭРСТВА

**Хто ўзыдзе на прафесійны Алімп?**

**22—23 мая ў Футбольным манежы пройдзе ІІІ Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus 2018», удзел у якім возьмуць больш як 320 навучэнцаў, студэнтаў і маладых рабочых з усіх рэгіёнаў краіны. Спаборніцтвы праводзяцца раз у два гады і даюць магчымасць адабраць самых перспектыўных удзельнікаў для іх далейшага выступлення на міжнародным узроўні. Між іншым, каб трапіць у фінал, трэба было пераадолець адборачныя рэгіянальныя спаборніцтвы. Чым жа трэці нацыянальны чэмпіянат адрозніваецца ад папярэдніх і каму, акрамя школьнікаў, якія яшчэ толькі задумваюцца над выбарам прафесіі, яго трэба наведаць? Пра ўсё гэта мы гутарым з рэктарам Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам Валерыем ГАЛУБОЎСКІМ:**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

### Новыя кампетэнцыі

— Па-першае, рэспубліканскі конкурс істотна пашырыў свае маштабы: у Футбольным манежы нам ужо цесна, і мы «захапілі» яшчэ і пляцоўку ў спартыўна-забаўляльным комплексе Falcon Club, куды выносім шэраг кампетэнцый, звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Пашыраецца і пляцоўка конкурсу па прафесійнай падрыхтоўцы сярод школьнікаў JuniorSkills.

Па-другое, спаборніцтвы пройдуць гэтым разам па 37 кампетэнцыях у такіх прафесійных сферах, як будаўніцтва і будаўнічыя тэхналогіі, вытворчасць і інжынерныя тэхналогіі, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, транспарт і лагістыка, сацыяльныя і персанальныя паслугі, творчыя прафесіі і мода. Для параўнання: на апошнім чэмпіянаце два гады таму было прадстаўлена 33 кампетэнцыі. Адна з новых — «дашкольная адукацыя». Мы цудоўна разумеем, што гэты кірунак падрыхтоўкі трэба сярод моладзі папулярызаваць.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X